Аляксандр Лукашанец
Нацыянальная акадэмія навук Беларусі

# СКЛАДАНЫЯ СЛОВЫ Ў СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫМ ГНЯЗДЗЕ: ДА ПРАБЛЕМЫ ЎНУТРЫГНЕДАВЫХ І МІЖГНЕДАВЫХ УЗАЕМАДЗЕЯННЯЎ І ПЕРАСЯЧАННЯЎ

У артыкуле на матэрыяле сучаснай беларускай мовы разглядаюцца месца і спецыфіка ўключэння складаных слоў у словаўтваральныя гнёзды. У прыватнасці, адзначана, што ў словаўтваральных гнёздах прадстаўлены практычна ўсе структурныя тыпы складаных паводле спосабу ўтварэння і па марфемнай будове лексічных адзінак:

1. Утвораныя: а) спосабам словаскладання (цэласна- і раздзельнааформленыя): *інтэрнэт-магазін*, *анлайн-продаж*, *выстаўка-продаж*, *хата-чытальня*; б) асновасловаскладання: *граз-е-лячэбніца*, *горн-а-металургічны*, *сам-а-ацэнка*; в) зрашчэння: *вечна/зялёны*, *густа/населены*; г) абрэвіяцыі: *аграбізнес* (аграрны бізнес), *сісадмін* (сістэмны адміністратар), *ВНУ* (вышэйшая навучальная ўстанова) і інш.; д) змешанымі спосабамі: складана-суфіксальным (*высак-а-гор-н-ы*, *пяц-і-курс-нік*), складана-прэфіксальным (*на-паў-галодны*, *на-паў-прытомны*), складана-прэфіксальна-суфіксальным (*на-паў-голас-а*, *на-паў-дароз-е*).

2. Утвораныя ад асноў складаных слоў іншымі спосабамі словаўтварэння: а) суфіксальным (*агульн-а-д*аступны → *агульнадаступн-асць*, *гарн-а-лыж-н-ы* → *гарналыжн-ік* → *гарналыжн-іц-а*), б) прэфіксальным (*далёкі* → *даль* → *даль-н-і* → *даль-а-бач-н-ы* → *не-дальнабачны*).

На канкрэтных прыкладах прадэманстравана, што ў беларускай мове складаныя словы ўтвараюцца ад слоў практычна ўсіх часцін мовы: назоўнікаў (*дом* → *дом-а-кіраўніцтва*, *джаз* → *джаз-аркестр*), дзеясловаў (*будаваць* → *вагон-а-будаў-ніч-ы*, *думаць* → *адн-а-дум-ец*), прыметнікаў (*агульны* → *агульн-а-даступны*, *дарожны* → *дарожн-а-транспартны*), займеннікаў (*сам* → *сам-а-адукацыя*, *сам-а-ацэнка*), лічэбнікаў (*адзін* → *адн-а-курс-нік*, *дзесяць* → *дзесяц-і-год-дз-е*) і г.д.

Таксама ў артыкуле паказваецца, што ў беларускай мове складаныя словы прадстаўлены ў значнай частцы словаўтваральных гнёзд (напрыклад, у 63 з 476 гнёзд на літару Д) і могуць складаць большасць адзінак у словаўтваральным гняздзе: напрыклад, у гняздзе *два* (234 словы з 302 з'яўляюцца складанымі), *дом* (30 з 55), *добры* (85 з 140).

У словаўтваральным гняздзе складаныя словы могуць знаходзіцца на розных ступенях словаўтварэння: 1-й (*адзін* → *адн-а-клас-нік*, *дом* → *дом-а-будаўнік*, *інжынер-канструктар*, *інтэрнэт-праект*), 2-й (*дакумент* → *дакумент-альн-ы* → *дакументальна-а-гістарычны*), 3-й (*далёкі* → *даль* → *даль-н-і* → *даль-а-бач-н-ы*) і інш. Асаблівасцю складаных слоў і вытворных ад іх адзінак з'яўляецца тое, што яны паралельна ўваходзяць у склад двух і больш словаўтваральных гнёзд і ўтвараюць у іх практычна аднолькавыя блокі: *добры* → *добр-а-ўпарадкаваць* → *добраўпарадкоў-ва-ць* → *добраўпарадкоўвац-ца* і *парадак* → *парадк-ава-ць* → *у-парадкаваць* → *добр-а-ўпарадкаваць* → *добраўпарадкоў-ва-ць* → *добраўпарадкоўвац-ца*. Пры гэтым, адны і тыя ж складаныя словы і іх вытворныя ў розных гнёздах могуць знаходзіцца на розных ступенях словаўтварэння, хаця маюць адну і тую ж словаўтваральную структуру: *інтэрнэт* → *інтэрнэт-аненцтва* (1-я ст.) і *агент* → *агенцтва* → *інтэрнэт-аненцтва* (2-я ст.); *інтэрнэт* → *інтэрнэт-апытанне* (1-я ст.) і *пытаць* → *апытаць* → *апытанне* → *інтэрнэт-апытанне* (3-я ст.);

Разгледжаныя асаблівасці ўключэння складаных слоў у словаўтваральныя гнёзды дазваляюць паставіць важныя і актуальныя як для тэорыі словаўтваральных гнёзд, так і практыкі складання гнездавых словаўтваральных слоўнікаў пытанні, якія патрабуюць

глыбокага аналізу і асэнсавання: Наколькі мэтазгодна дубліраванне аднолькавых па структуры і складзе блокаў складаных слоў у розных словаўтваральных гнёздах? Ці не з'яўляецца больш апраўданым і мэтазгодным з прагматычнага і практычнага пункту гледжання пакідаць гэтыя блокі толькі ў адным словаўтваральным гняздзе з вяршыняй – першай часткай складанага слова? Ці павінны паслядоўна ўключацца ў словаўтваральныя гнёзды ініцыяльныя абрэвіятуры? Ці дапушчальна выдзяляць складаныя словы і вытворныя ад іх афіксальныя адзінкі ў асобныя словаўтваральныя гнёзды з вяршыняй – першай часткай складанага слова?

## ЛІТАРАТУРА


КЛИМЕНКО Н. Ф. *Абревіатура*. У: Українська мова. Енциклопедія. Редкол. Тараненко О. О. та ін. 3-е вид. Київ: Вид-во "Укр. енцикл." ім. М. П. Бажана, 2007а. – С. 7.

КЛИМЕНКО Н. Ф. Складне слово. У: Українська мова. Енциклопедія. Редкол. Тараненко О. О. та ін. 3-е вид. Київ: Вид-во "Укр. енцикл." ім. М. П. Бажана, 2007б. – С. 625.

ЛОПАТИН В. В. *Аббревиатура*. У: Русский язык: Энциклопедия. Ред. Караулов Ю. Н. Москва: Научное издательство "Большая Российская энциклопедия", 2003а. С. 9–10.

ЛОПАТИН В. В. *Сложносоставные слова*. У: Русский язык: Энциклопедия. Ред. Караулов Ю. Н. Москва: Научное издательство "Большая Российская энциклопедия", 2003б. – С. 516.

ЛОПАТИН В. В., УЛУХАНОВ, И. С. Словарь словообразровательных аффиксов современного русского языка. Москва: Издательский центр "Азбуковник", 2016.

ЛУКАШАНЕЦ А. А. *Адзінкі словаўтварэння.* У: Беларуская мова: Энцыклапедыя. Рэд. Міхневіч А. Я. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1994а. С. 14–15.

ЛУКАШАНЕЦ А. А. Словаўтварэнне і граматыка. Мінск: Права і эканоміка, 2001.

УЛУХАНОВ И. С. *Сложное слово*. У: Русский язык: Энциклопедия. Ред. Караулов Ю. Н. Москва: Научное издательство "Большая Российская энциклопедия", 2003. С. 514–515.

ШАКУН Л. М. Словаўтварэнне. Мінск: Вышэйшая школа, 1978.


## КРЫНІЦЫ


ЛУКАШАНЕЦ А. А., РУСАК В. П. (рэд.). Слоўнік беларускай мовы. Мінск: Беларуская навука 2012

УЛАСЕВІЧ В. І., ДАЎГУЛЕВІЧ Н. М. Беларуска-рускі тлумачальны слоўнік новых слоў і новых значэнняў. Мінск: Аверсэв, 2013.